А. С. Пузікава

# БІТВА ПАД ПАЛОНКАЙ У КАНТЭКСЦЕ РУСКА-ПОЛЬСКАЙ ВАЙНЫ 1654-1667

У 1648 годзе пачалася вызваленчая вайна ўкраінскага народа пад правадырствам Багдана Хмяльніцкага, у выніку якой Польшча згубіла некаторыя тэрыторыі. У 1653 годзе ў новых сутыкненнях паміж арміямі польскіх і ўкраінскіх войскаў Багдан Хмяльніцкі пачаў цярпець няўдачы і таму вырашыў прасіць дапамогі ў Рускага царства. Пасля рашэння Земскага сабора ад 1 (11) Кастрычніка 1653 года аб прыняцці ў расійскае падданства Войска Запарожскага «з гарадамі іх і з землямі» пасля неаднаразовых просьбаў гетмана Багдана Хмяльніцкага ў 1654 годзе пачалася руска-польская вайна 1654-1667 гг.

Трынаццацігадовая вайна пачалася з уварвання дзвюх маскоўскіх армій сумесна з войскам казакоў. Галоўная групоўка (41 тысяча ваяроў) на чале з царом наступала на Смаленск, Мсціслаў і Магілёў, паўночная група (16 тысяч ратнікаў) пад камандаваннем Васіля Шэрамецева — на Себеж, Полацк і Віцебск, 20 тысяч казакоў атамана Івана Залатарэнка — на Старадуб, Гомель і Рэчыцу. У 1660 годзе Ляхавічы былі абложаныя маскоўскім войскам пад кіраўніцтвам Івана Хаванскага. Польска-літоўская групоўка Паўла Сапегі і Стэфана Чарнецкага бачыла неабходнасць у іх вызваленні. Хаванскі паслаў у бок суперніка моцны раз'езд колькасцю ў 2000 ваяроў пад камандаваннем Нашчокіна. Сапега таксама выслаў раз'езд у 13 харугваў на чале з Самуэлем Кміцэцэм і Станіславам Ліпніцкім. Абодва раз'езда сустрэліся 27 чэрвеня каля мястэчка Палонка.

Ліцвіны разам з раз'ездам Сапегі для рашаючага бою спыніліся на беразе ракі Палонка: Хаванскі набліжаўся з усходу, і за ўзнёсласцю ў лукавіне ракі магла схавацца некаторая частка войска. Пазіцыя польскай арміі, з аднаго боку, абараняла яго ад раптоўнай атакі праціўніка, а з другога боку, у выпадку адступлення (і тым больш уцёкаў) ператваралася ў смяротную пастку.

Першай адбылася сутычка з авангардам. Наперадзе сваіх галоўных сіл Хаванскі выставіў «перемётчиков» пад камандаваннем Фларыяна Слонского. Стрымліваць напор рускіх войск было нялёгка, нягледзячы на тое, што Чарнецкі заклікаў сваіх салдат трымацца з усіх сіл. Дзеля таго, каб зрабіць дымавую заслону, яны падпалілі некаторыя дамы ў мястычку. Вынікі першага бою былі для Рэчы Паспалітай нядрэнныя. Маскоўскі ваявода, аднак, у сваёй перамозе быў упэўнены. Рускія захавалі намер напасьці спачатку на левае крыло суперніка. Камандзірам гэтага крыла з'яўлялся Сямён Лукіч Шчарбатаў. Паблізу плаціны, за гаем, у тыле знаходзіўся князь Трубяцкі, які кіраваў часткай конніцы. У фальварку Пацяны на ўсходнім беразе Палонкі Хаванскі размясціў чатыры гарматы і атрад пяхоты. Пэўны рух на другім беразе ён прыняў за пачатак адступлення, але гэта быў толькі манеўр Чарнецкага і Сапегі для вымантачвання маскавітаў з выгадных пазіцый. Хаванскі адправіў пяхоту Шчарбатава за плаціну, куды потым падыйшлі конныя харугвы Чарнецкага. Калі на апошнія перайшла ўвага расійскага войска, Павел Сапега і гусары Аляксандра Палубінскага пачалі наступ на яго правае крыло, конніца ў якім, аднак, спыніла літоўцаў. Гэтая паўза дазволіла маскоўцам пачаць контрнаступленне і зайсці ў тыл войскаў Сапегі. Перамозе палякаў паспрыяла з'яўленне новых фармаванняў ВКЛ, што ўступалі ў бітву. Паводле розных звестак, у бітве на рацэ Палонка загінула ад 10 да 16 тысяч маскавітаў. Паражэнне арміі Хаванскага пад Палонкай здолела на некаторы час змяніць расклад сіл бакоў на літоўскім тэатры ваенных дзеянняў. Перамога Рэчы Паспалітай з'явілася пачаткам пералому ў вайне. Да амаль што поўнага вызвалення краіны і падпісання Андросаўскага перамір'я заставалася яшчэ сем гадоў, але гэта быў значны шаг да заканчэння вайны. 2 лістапада 1994 года на горцы каля вёскі Палонка адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнага знака ў гонар перамогі 1660 года. У 2000 годзе члены Баранавіцкага савета Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны аднавілі драўляную шыльду ў гонар Палонкаўскай бітвы. Але і гэты знак знішчылі невядомыя. У 2015 годзе на месцы бітвы пад Палонкай усталявалі новы памятны знак.

### *Спіс літаратуры*


1. Krzysztof Kossarzecki, "Kampania roku 1660 na Litwie". Zabrze: Inforteditions, 2005.
2. Малов А. В. "Русско-польская война 1654—1667". М.: Цейхгауз, 2006.
3. Курбатов О. А. "Литовский поход 7168 г."кн. И. А. Хованского и битва при Полонке 18 июня 1660 г. Славяноведение, 2003.



*Пузікава Анастасія Сяргееўна*, студэнтка ФКСІС БДУІР, anastasiya.puzikova@yandex.by
*Навуковы кіраўнік: Літвіноўская Юлія Іванаўна*, к. г. н., дацэнт.